ШКЛЯНЫ ШАР

Комікс аб аднаўляльных
крыніцах энергіі

АБ ПРАЕКЦЕ

Гэты комікс накіраваны на пашырэнне ведаў маладога пакалення аб такіх пытаннях, як энергаэфектыўнасць і аднаўляльныя крыніцы энергіі, а таксама аб шкодзе, якая наносіцца навакольнаму асяроддзю і прыродзе ў выніку растраты энергіі.

Гэта крыніца задавальнення і захаплення для дзяцей, а таксама карысны інструмент, поўны парадаў і хітрыкаў наконт аднаўляльных крыніцах энергіі.

Комікс аб аднаўляльных крыніцах энергіі

ПРА АПАВЯДАННЕ

Гісторыя чатырох сяброў і іх хатняга хамячка пераносіць чытача ў месца, дзе адзіным злыднем з'яўляецца невуцтва і недавер.

Нашыя галоўныя героі здольваюць не толькі пераадолець усе перашкоды, але і змяніць свет да лепшага простым актам распаўсюджвання усвядомленасці і дабрыні.

Шкляны Шар

2023

МАЛЕНЬКІ ГАРАДОК ПОБАЧ З ЛЕСАМ ЖЫВЕ СВАІМ ЦІХІМ, ПАВОЛЬНЫМ ЖЫЦЦЁМ.
НА ПЕРШЫ ПОГЛЯД, ЖЫХАРЫ ІМКНУЦЦА БЕРАЖЛІВА СТАВІЦЦА ДА ЭНЕРГІІ І ДАПАМАГАЦЬ ПЛАНЕЦЕ ВЫЛЕЧВАЦЦА.

АДНАК, НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ , ВІДАЦЬ, ЦЯЖЭЙ ВЫКАРАНІЦЬ.

ЛІЯ РЫ ХТУЕЦЦА ДА НАВУКОВАГА КІРМАШУ, ЯКІ МАЕ АДБЫЦЦА НАСТУПНАЙ РАНІЦАЙ.

ЯЕ НАЙНОЎШАЕ ВЫ НАХОДНІЦТВА - ГЭТА ШКЛЯНЫ ШАР - ПРЫ ПАДКЛЮЧЭННІ ДА ДАДАТКА ДЛЯ НАДВОР'Я ЁН АДЛЮСТРОЎВАЕ СТАН ЗА АКНОМ.

АЙ, ЛУНА! ХІБА ТЫ НЕ БАЧЫШ, ШТО Я РАБЛЮ НЕШТА ВАЖНАЕ???

АКРАМЯ ТАГО, ХАМЯЧКАМ НЕ ПАТРЭБНА ВОПРАТКА

ГЛЯДЗІ, ЛІЯ, СУПЕРГЕРОЙСКІ ШВЭДАР ДЛЯ СУПЕРГЕРОЯ ХАМЯЧКА!

У ЛУНЫ З'ЯВІЛАСЯ НОВАЕ ХОБІ- ВЯЗАННЕ ШВЭДРАЎ ДЛЯ ХАМЯЧКОЎ.
ОЗІ, ЗДАЕЦЦА, НЕ ЗАНАДТА ЗАДАВОЛЕНЫ ГЭТЫМ, ЯК І ЛІЯ.

ДОБРА, ДОБРА, МЫ СЫ ХОДЗІМ... АЛЕ Ж, ДАРЭЧЫ , ІМ ЯНА ПОТРЭБНА.

МАКС І ДЭНІ ЗАСНАВАЛІ ШКОЛЬНЫ КЛУБ, ПРЫ СВЕЧАНЫ ЭНЕРГАЭФЕКТЫ ЎНАСЦІ.

У ІХ ТАКСАМА ЁСЦЬ ПАПУЛЯРНЫ ІНСТАДРАМ-АКАЎНТ. ОЗІ – ЯГО ГАЛОЎНАЯ ЗОРКА.

ІНСТАДРАМЕР 2:
УХ ТЫ , ОЗІ! ТЫ ЗАПАЛЬВАЕШ!

ІНСТАДРАМЕР 1:
ГЭТЫ ХАМЯЧОК - МАЯ ДУХОЎНАЯ ЖЫВЁЛА!

ІНСТАДРАМЕР 3:
Я ПАКАЖУ ГЭТА СВАЁЙ СТАРЭЙШАЙ СЯСТРЫ , ЯНА ЗАЎСЁДЫ ПАКІДАЕ СВЯТЛО ЎКЛЮЧАНЫМ.

выпадковае ток Шоу

ПРАФЕСАР СЛЭЙТ, КАЛІ ЛАСКА, РАСКАЖЫ ЦЕ НАМ, ШТО ВЫ ДАВЕДАЛІСЯ НА ДАДЗЕНЫ МОМАНТ.

Я БАЧУ, ШТО ЛЮДЗІ МЯНЯЮЦЬ СВАЕ ПАВОДЗІНЫ , АЛЕ Я АДЧУВАЮ, ШТО ГЭТАГА МОЖА БЫЦЬ НЕДАСТАТКОВА.

МАГЧЫМА, НАМ ПАТРЭБНЫ ВЯЛІКІЯ КРОКІ.

ПРАФЕСАР СЛЭЙТ ПАДАРОЖНІЧАЕ ПА СВЕЦЕ, РАСПАВЯДАЮЧЫ ЛЮДЗЯМ ПРА ЭНЕРГАЭФЕКТЫ ЎНАСЦЬ.





ДАВАЙ НАКРЫ ЕМ ЯЕ КОЎДРАЙ. ЁЙ ТРЭБА КРЫ ХУ АДП АЧЫ ЦЬ ПЕРАД ЗАЎТРАШНІМ.

УДЗЕЛЬНІКІ НАВУКОВАГА КІРМАШУ ПРАДСТАЎЛЯЮЦЬ СВАЕ ВЫ НАХОДКІ.

ОЗІ!!! ШТО ТЫ ТАМ РОБІШ?!

УП С!!!!!!

Beep! Beep!

П АГЛЯДЗІЦЕ НА ДАТУ!!!

03.10 2059 10:05

ЛІЯ, ШТО ГЭТА? ТЫ СТВАРЫЛА НЕЙКУЮ ПРАГРАМУ, ЯКАЯ ПАКАЗВАЕ... НАШУ БУДУЧЫНЮ?

Я НЕ... Я НЕ ВЕДАЮ... Я МУШУ ІСЦІ! ВЫ БАЧАЙЦЕ! МНЕ ТАК ШКАДА!

лямпачка

@ Усе

Прыходзьце да мяне!

Я НЕ РАЗУМЕЮ - ПАВІННА БЫЦЬ, ОЗІ НАЦІСНУЎ НА КНОПКУ... ЦЯПЕР ШАР ПАКАЗВАЕ НАДВОР'Е Ў БУДУЧЫ НІ!

І СЯБРЫ , ГЭТА САПРАЎДЫ НЕ ВЫ ГЛЯДАЕ ШМАТАБЯЦАЛЬНА.

ШТО ТЫ ЗРАБІЎ, МАЛЕНЬКІ ЧАРАЎНІК?

МОЖА, ГЭТА ЗВЯЗАНА З НАШЫМ СПАЖЫВАННЕМ ЭНЕРГІІ?

МЫ МУСІМ СПЫТАЦЬ ПРАФЕСАРА СЛЭЙТА! ЁН БУДЗЕ ВЕДАЦЬ, ШТО РАБІЦЬ.

ЯК БЫ ЦЦАМ Я САМА ПРА ГЭТА НЕ ДУМАЛА! Я СПРАБАВАЛА ДАТЭЛЕФАНАВАЦЦА ДА ЯГО ЎВЕСЬ ДЗЕНЬ.

НЕ АДКАЗВАЕ!

ПОЙДЗЕМ!

ПОЙДЗЕМ У ЛАБАРАТОРЫЮ, ЁН ЗАЎСЁДЫ ТАМ...

АД ГЭТАГА МЕСЦА Ў МЯНЕ МУРАШКІ ПА СКУРЫ ...

10

СЛЭЙТ!!! ПРАФЕСАР! ГЭЙ? ЦІ ЁСЦЬ ТУТ ХТО?

ШТО ГЭТА ТАКОЕ? ДЗЕ ПРАФЕСАР СЛЭЙТ?


ГЛЯДЗІЦЕ!
ГЭТА СОНЕЧНАЯ ПАНЭЛЬ.
ЁН, МАБЫ ЦЬ, ПРАЦУЕ НАД
НОВЫ М ВЫНАХОДСТВАМ!


ВАЎ. ШТО МЕНАВІТА
ГЭТА ЗА ШТУКА?

ММ, ВЫ БАЧЫ ЦЕ
ТОЕ Ж, ШТО І Я?
ПРАФ... ПРАФЕСАР?...
21Р

ПРЫ ВІТАННЕ, СЯБРЫ !
ШУКАЕЦЕ МЯНЕ?
ШТО Ж, Я СЛЭЙТ... ТЭХНІЧНА.
ХОЦЬ Я Б УПАДАБАЎ,,
КАБ ДА МЯНЕ ЗВЯРТАЛІСЯ
ПА МЯНУШЦЫ - ГАДЖЭТ ТЭЙЛЗ.

ХТО ВЫ ?
МЫ ШУКАЕМ
ПРАФЕСАРА СЛЭЙТА.
КАРНЭЛІУС - МОЙ БРАТ.

ТАК ШТО МЕНАВІТА Т
Ы ТУТ РОБІШ?
І ДЗЕ ПРАФЕСАР СЛЭЙТ?

ТАК ШТО Я ПАЗЫ ЧУЯГО ЛАБАРАТОРЫ Ю.
Я САМ ІНЖЫНЕР:


Я ДАСЛЕДУЮ АДНАЎЛЯЛЬНЫ
Я КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ І СТВАРАЮ
ПАДОБНЫ Я ПРЫ ЛАДЫ
OZZY!

ДЫ К ТАДЫ ВЫ МУСІЦЕ ДАПАМАГЧЫ НАМ ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО ТУТ АДБЫВАЕЦЦА! МЕРКАВАЛАСЯ, ШТО ГЭТА БУДЗЕ МОЙ ПРАЕКТ НА НАВУКОВЫ М КІРМАШЫ , АЛЕ...

ТЫ ГЭТА СТВАРЫ ЛА? ПА-ПЕРШАЕ - ВАУ! НАГАДАЙ, КОЛЬКІ ТАБЕ ГАДОЎ? ХАЛЕРА, ДЗЕЦІ Ў НАШЫ ДНІ...

ПА-ДРУГОЕ, МНЕ ПАТРЭБНЫ ПАДРАБЯЗНАСЦІ, ЯК ГЭТА АДБЫЛОСЯ? 2059? ВЫ ЎПЭЎНЕНЫ Я, ШТО ГЭТА ПРАВІЛЬНА?

ВОСЬ САПРАЎДНЫ ГЕРОЙ!

НАШ ХАМЯЧОК ЗАЛЕЗ ЎНУТР ШКЛЯНОГА ШАРА І, МАБЫ ЦЬ, НАЦІСНУЎ НА НЕШТА - Я НЕ ВЕДАЮ - ШАР ПАВІНЕН БЫ Ў АДЛЮСТРОЎВАЦЬ СЁННЯШНЯЕ НАДВОР'Е,

АЛЕ ЁН ПЕРАТВАРЫ ЎСЯ Ў МАШЫ НУ ДЛЯ ПРАДКАЗАННЯ ЛЁСУ! ЯК ВЫ МОЖАЦЕ ГЭТА Р АСТЛУМАЧЫ ЦЬ?

ГЭТА МЕНАВІТА ТОЕ, ПРА ШТО Я ЎСІХ ПАПЯРЭДЖВАЎ. ТАК ХУТКА, І ТАК СУМНА... ШТО Ж, АДЗІНЫ ВЫ БАР, ЯКІ Ў НАС ЁСЦЬ, - ГЭТА ПАСПЯШАЦЦА З НАШЫ М ПЛАНАМ...

З ЯКІМ ПЛАНАМ?

НУ, ПРОСТА ЭКАНОМІЦЬ ЭНЕРГІЮ НЕДАСТАТКОВА, НАМ ТАКСАМА ТРЭБА ПАЧАЦЬ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ АДНАЎЛЯЛЬНУЮ ЭНЕРГІЮ. ВА ЎСЯГО ЁСЦЬ МЯЖА, ВЕДАЕЦЕ...

АДНАЎЛЯЛЬНАЯ ЭНЕРГІЯ - ГЭТА ЭНЕРГІЯ, ЯКАЯ АТРЫМЛІВАЕЦЦА З ПРЫРОДНЫХ КРЫНІЦ (СОНЕЧНАЯ, ВЕТРАВАЯ, ГІДРАЭНЕРГІЯ І Г.Д.), І НАТУРАЛЬНЫМ ЧЫНАМ ПАПАЎНЯЕЦЦА З БОЛЬШАЙ ХУТКАСЦЮ, ЧЫМ СПАЖЫВАЕЦЦА. ВЫТВОРЧАСЦЬ І ПЕРАЎТВАРЭННЕ ТАКОЙ ЭНЕРГІІ Ў ДРУГАСНУЮ (НАПРЫКЛАД, У ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ) НЕ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЗАБРУДЖВАННЯ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ.

...У ТЫМ ЛІКУ І Ў ГЭТАГА ШКЛЯНАГА ШАРА. ЗАСТАЛОСЯ НЕ БОЛЬШ ЗА ТЫ ДЗЕНЬ ДА ЯГО САМАСТОЙНАЙ ПЕРАЗАГРУЗКІ - ЯК ТОЛЬКІ ЯНА АДБУДЗЕЦЦА, МЫ НЕ ЗМОЖАМ УБАЧЫЦЬ, ЦІ АТРЫМАЛАСЯ Ў НАС НЕШТА ЗМЯНІЦЬ.

Я ПАДЗЯЛЮСЯ З ВАМІ ЎСІМ, НАДЧЫМ ПРАЦАВАЎ, І, МАГЧЫМА, ТОЛЬКІ МАГЧЫМА, НАМ ПАШЧАСЦІЦЬ ЗМЯНІЦЬ БУДУЧЫНЮ.

ЧАГО Ж МЫ ЧАКАЕМ? ДАВАЙЦЕ ЗРОБІМ ГЭТА!



СОНЕЧНЫЯ ПАНЭЛІ ПЕРАЎТВАРАЮЦЬ СОНЕЧНУЮ ЭНЕРГІЮ Ў ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ. У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД КОЛЬКАСЦІ СОНЕЧНАГА СВЯТЛА І ПАМЕРУ ПАНЭЛІ, ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ, ЯКУЮ ЯНА ВЫПРАЦОЎВАЕ, МОЖА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ДЛЯ СПАЖЫВАННЯ ДЗЕ ЗАЎГОДНА - АД МАБІЛЬНЫХ ТЭЛЕФОНАЎ ДА ЦЭЛЫХ ДАМОЎ - АБО НАЗАПАШВАЦЦА Ў БАТАРЭЯХ НА ПОТЫМ.

ПАДОБНА ПАНЭЛЯМ, СОНЕЧНЫЯ КАЛЕКТАРЫ ТАКСАМА ПЕРАЎТВАРАЮЦЬ СОНЕЧНУЮ ЭНЕРГІЮ. АДЗІНАЕ АДРОЗНЕННЕ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО КАЛЕКТАРЫ ПЕРАЎТВАРАЮЦЬ ГЭТУЮ ЭНЕРГІЮ Ў ЦЯПЛО, А НЕ Ў ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ.

СОНЕЧНЫЯ ПЕЧЫ - ГЭТА ЦУДОЎНЫ СПОСАБ ПРЫГАТАВАЦЬ ЛЮБІМУЮ ЗАКУСКУ, ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ ТОЛЬКІ СОНЕЧНУЮ ЭНЕРГІЮ. МАЮЧЫ ЎСЯГО ТОЛЬКІ ПУСТУЮ СКРЫНКУ З-ПАД ПІЦЫ І ПАРУ ЛІСТОЎ ФАЛЬГІ, ВЫ ТАКСАМА МОЖАЦЕ ЗБУДАВАЦЬ СВАЮ ЎЛАСНУЮ СОНЕЧНУЮ ПЕЧ ДЛЯ ГАТОЎКІ БУТЭРБРОДАЎ, ПЕЧЫ ВА АБО НАВАТ ХОТ-ДОГАЎ Ў ГАРАЧЫ ЛЕТНІ ДЗЕНЬ.

WIND POWER STATIONS
forebay
Power house
head
Turbine
ВЕТРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ - ГЭТА ГРУПА ВЕТРАВЫХ ТУРБІН, РАЗМЕШЧАНЫХ У АДНЫМ МЕСЦЫ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ.
НЕВЯЛІКАЯ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ ВЫПРАЦОЎВАЕ ДА 100 КВТ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ У ГАДЗІНУ, ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ ТОЛЬКІ БЯГУЧЫЯ РУЧАІ АБО ПАТОК ВАДЫ. ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ АД ГЭТЫХ СІСТЭМ МОЖА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ДЛЯ ХАРЧАВАННЯ ІЗАЛЯВАНЫХ ДАМОЎ АЛЬБО ЦЭЛЫХ СУПОЛЬНАСЦЯЎ.
МЫ ВЫРАТУЕМ ЛЕС, МЫ ВЫРАТУЕМ МОРА - ТАМУ ШТО МЫ ЭКАНОМІМ ЭНЕРГІЮ, ПРАСЦЕЙ ПРОСТАГА!


ТЫ ДЗЕНЬ ПРАЛЯЦЕЎ ЯК АДНО ІМГНЕННЕ. УВЕСЬ ГОРАД УНЁС СВОЙ УКЛАД. АЛЕ БУДУЧЫНЯ, ЗДАЕЦЦА, ПАЛЯПШАЕЦЦА НЕДАСТАТКОВА ХУТКА.
ГЛЯДЗІ, ТЭЙЛЗ! ТАМ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ ЗЕЛЯНЕЙ. НАПЭЎНА, ГЭТА ПРАЦУЕ, ТАК?
МЫ НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ. АЛЕ ГЭТАГА МОЖА БЫЦЬ НЕДАСТАТКОВА... АБ ГЭТЫМ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ БОЛЬШ ЛЮДЗЕЙ!
ВЕСТКА АБ ШКЛЯНЫМ ШАРЫ І НЕБЯСПЕКАХ БУДУЧЫНІ РАСПАЎСЮДЗІЛАСЯ ПА ГОРАДЗЕ І ЎСЯМУ СВЕТУ. ЛЮДЗІ ВА ЎСІМ СВЕЦЕ ПАЧЫНАЮЦЬ МЯНЯЦЬ СПОСАБ ВЫТВОРЧАСЦІ ЭНЕРГІІ.
2 DAYS
23:52
HOURS REMAINING

01:30
HOURS REMAINING
У НАС АМАЛЬ НЕ ЗАСТАЛОСЯ ЧАСУ!


НАШЫ Х НАМАГАННЯЎ, ЗДАЕЦЦА, НЕДАСТАТКОВА! МОЖА НАМ ЧАГОСЬЦІ БРАКУЕ?!

УВЕСЬ ГОРАД ЗБІРАЕЦЦА ПЕРАД ВЯЛІКІМ ЭКРАНАМ, ЯКІ ТРАНСЛЮЕ СІТУАЦЫЮ ЎНУТРЫ ШКЛЯНОГА ШАРА.
ШТО АДБЫ ВАЕЦЦА? ХІБА ЁН НЕ ПРАЦУЕ?
СПАДЗЯЮСЯ, МЫ ПАСПЕЕМ!
01:30
HOURS REMAINING



ГЭЙ, МАЛЕНЬКІ ЧАРАЎНІК, АДНОЙЧЫ ТАБЕ ГЭТА ЎДАЛОСЯ! ДАПАМАЖЫ НАМ ЯШЧЭ РАЗ - ДАВЕДАЙСЯ, ШТО МЫ , МАГЧЫМА, ПРАПУСЦІЛІ!



СЯБРЫ , ГЛЯДЗІЦЕ! Я ДУМАЮ, ОЗІ СПРАБУЕ НАМ НЕШТА СКАЗАЦЬ!


ПАЧАКАЙЦЕ, ХІБА ГЭТА НЕ НАША ШКОЛА? ШТО ГЭТА НА ДАХУ?


ГЭТА СОНЕЧНАЯ ПАНЭЛЬ! ВОСЬ ДЗЕ МЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ЯЕ ПАБУДАВАЦЬ!!! ЦЯПЕР УЖО ЗАНАДТА ПОЗНА! МЫ НІЯК НЕ ПАСПЕЕМ! ПРОСТА НЕ ХАПАЕ ЧАСУ...




СЯБРЫ , ГЛЯДЗІЦЕ!





ПРАФЕСАР, МОЙ ПРАЕКТ... НАШ ГОРАД - ЁН РАЗБУРАНЫ У БУДУЧЫНІ.
ОЗІ ЗАЛЕЗ УНУТР, АЛЕ ЎЖО ЗАНАДТА ПОЗНА.
ШТО Ж, ЁН ДАКЛАДНА ВЕДАЕ, ЯК ЗРАБІЦЬ ЭФЕКТНЫ ВЫХАД!

СУПАКОЙЦЕСЯ ЎСЕ! Я ВЕДАЮ! Я ДАБРАЎСЯ СЮДЫ ТАК ХУТКА, ЯК ТОЛЬКІ ЗМОГ. СПАДЗЯЁМСЯ, ШТО Я НЕ ЗАНАДТА СПАЗНІЎСЯ...


ГЭТА ГАТОВАЯ СОНЕЧНАЯ ПАНЭЛЬ, ВЫ РАБЛЕНАЯ НА ЗАКАЗ ДЛЯ ВАШАЙ ШКОЛЫ . УЛІЧВАЮЧЫ ЎСЕ НАМАГАННІ, ЯКІЯ ВЫ ЎКЛАЛІ Ў ГЭТУЮ СПРАВУ,
ГЭТАГА ПАВІННА БЫЦЬ ДАСТАТКОВА, КАБ ПРАДУХІЛІЦЬ БУДУЧУЮ КАТАСТРОФУ.








ПАГЛЯДЗІЦЕ НА ВОКНЫ ШКОЛЫ! СОНЕЧНАЯ ПАНЭЛЬ ПРАЦУЕ!!!

ЗА ЭНЕРГІЮ, ЯКОЙ ВЫ , СЯБРЫ , ВАЛОДАЕЦЕ, І ЗА ДУХ, ЯКІ ВЫ П АДЗЯЛЯЕЦЕ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА СВАЮ БУДУЧЫ НЮ!

ЗА БУДУЧЫ НЮ!

БУДЗЬМА!

ОЗІ! ТЫ МОЙ ГЕРОЙ! ОЙ-ОЙ, І П АГЛЯДЗІЦЕ, ХТО П РЫ ЙШОЎ АДСВЯТКАВАЦЬ – ГЭТА Ж РОЗІ!

ЗАМЕНА ЗВЫ ЧАЙНЫ Х КРЫ НІЦ ЭНЕРГІІ ЧЫ СТЫ МІ, АДНАЎЛЯЛЬНЫ МІ ВАРЫ ЯНТАМІ, ТАКІМІ ЯК СОНЕЧНАЯ, ВЕТРАВАЯ АБО ГІДРАЭНЕРГІЯ, З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫ РАШАЛЬНЫ М КРОКАМ У ЗНІЖЭННІ ЗАБРУДЖВАННЯ І ЗАБЕСПЯЧЭННІ ТАГО, КАБ НАША П ЛАНЕТА ЗАСТАВАЛАСЯ ЗЯЛЁНЫ М І ГАСЦІННЫ М ДОМАМ ЯК ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ, ТАК І ДЛЯ ЖЫ ВЁЛ НА ДОЎГІЯ ГАДЫ НАП ЕРАД.

Publisher and proprietor:
Council of European Energy Regulators
Cours Saint-Michel 30a, 1040 Brussels, Belgium
Tel.: +32 (0)2 788 73 30
Fax: +32 (0)2 788 73 50
www.ceer.eu
e-mail: brussels@ceer.eu
twitter.com/CEERenergy
https://www.linkedin.com/company/council-of-european- energy-regulators/
https://www.facebook.com/CEERenergy
Created by Windfor's Tbilisi
© Council of European Energy Regulators in the framework of the EU4Energy Programme – "Promoting the Clean Energy Transition in the Eastern Partnership Countries: EU4Energy Phase II"

Co-funded by
the European Union

Гэтая публікацыя была падрыхтавана пры фінансавай
падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Яе змест з'яўляецца выключнай
адказнасцю Савета еўрапейскіх рэгулятараў у галіне энергетыкі
і не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання Еўрапейскага Саюза.